**Урбан, В. В.** Ідыяматыка / В. В. Урбан // Культура Беларусі : энцыклапедыя. Т. 4. / рэдкал.: У. Ю. Аляксандраў (гал. рэд) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П.Броўкі, 2013. – С. 172.

**ІДЫЯМА́ТЫКА** 1) сукупнасць ідыём пэўнай мовы. У склад **І.** некаторыя даследчыкі акрамя ўласна ідыём адносяць прымаўкі і прыказкі, моўныя формулы і інш. Крыніцамі **І**. могуць быць: фальклор, прафесійнае маўленне, насычанае ўстойлівымі зваротамі, біблеізмы (цытаты з рэлігійных кніг), “гамерызмы” (цытаты з твораў Гамера і іншых антычных аўтараў), індывідуальна-аўтарскія ўтварэнні, цытаты з публіцыстыкі. У **І.** захоўваюцца сістэма каштоўнасцей, грамадская мараль, традыцыі, гісторыя і культура народа, адносіны да навакольнага свету, да іншых народаў. Беларуская **І.** – сфера праяўлення нацыянальнай самабытнасці і непаўторнасці беларускага народа. 2) раздзел мовазнаўства, які вывучае лексіка-граматычны склад, характар значэння, сінтаксічныя і экспрэсіўна-стылістычныя ўласцівасці ідыём як спецыфічных адзінак мовы.

*Літ.*: Аксамітаў А.С. Беларуская фразеалогія. Мінск, 1978; Лепешаў І.Я. Фразеалогія сучаснай беларускай мовы. Мінск, 1998.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ